Источник: **«Звязда» - 2012-06-05**

# Гаючая сіла беларускай прыроды ў руках руплівых гаспадароў

## Казка пра жывую ваду

Хто ў дзяцінстве не чуў казак пра жывую ваду, якая вылечвала любыя хваробы, раны, ставіла нямоглых на ногі і нават падымала з магіл? Шкада, што разам з дзяцінствам мы страчваем веру ў цуды, якія здаваліся раней такімі рэальнымі. Але ці казачныя тыя цуды? Многія наведнікі санаторыяў "Белаграздраўніцы" паверылі ў іх рэальнасць і выпрабавалі на сабе гаючую сілу ўнікальнай "жывой" вады з недраў беларускай зямлі. Таму і прыязджаюць сюды зноў і зноў. А яна і сапраўды, нібы чароўная, дорыць здароўе і сілы кожнаму, хто п'е з яе вытокаў.

У казках па жывую ваду трэба было ехаць за край свету, а ў рэальнасці — яна побач, і выпрабаваць яе на сабе можна, наведаўшы адзін з санаторыяў "Белаграздраўніцы".



***Шаноўныя сябры!***

***Запрашаем вас наведаць нашы санаторыі. Мы ўпэўнены, што дзівосы беларускай прыроды, добразычлівасць і прафесіяналізм нашых супрацоўнікаў, сучасная медыка-дыягнастычная база дапамогуць вам аднавіць і ўмацаваць сваё здароўе на доўгія гады. Менавіта для гэтага мы і працуем.***

**З павагай, генеральны дырэктар ААТ "Белаграздраўніца"**
**І.Ф. Аверчанка.**

**Забраніраваць і набыць пуцёўкі можна па адрасе: вул. Фабрыцыуса, 7а, 220007, г. Мінск.**
**па тэлефонах: тэл.: (017) 200 44 64, 298 54 00,**
**факс: (017) 200 44 64, 200 40 53,**
**e-mail:** info@agrozdrav.by.
**На сайце прадпрыемства:http://www.agrozdrav.by**

## Стрэс ці аздараўленне — выбар за вамі

Штогод сотні тысяч нашых суайчыннікаў імкнуцца паправіць здароўе на марскіх курортах Крыма, Турцыі, Балгарыі, Егіпта і іншых краін, свята верачы, што альтэрнатывы ў плане павышэння імунітэту марскому ўзбярэжжу няма. І нават не падазраюць, як памыляюцца. Многія імунолагі лічаць, што папраўляць здароўе трэба менавіта ў зонах кліматычнага пражывання. Больш за тое, адпачынак на працягу 10-14 дзён ва ўмовах іншага клімату (напрыклад, з высокімі тэмпературамі і нізкай вільготнасцю) можа быць нават шкодным. Бо арганізму патрэбен недзе тыдзень для акліматызацыі, і толькі потым кліматычныя ўмовы пачынаюць прыносіць карысць. Але сцэнарый адпачынку звычайна іншы. Прыехаўшы ці прыляцеўшы на марское ўзбярэжжа, нашы суайчыннікі кідаюцца напоўніцу выкарыстоўваць сонца, мора, мясцовую кухню, заганяючы свой арганізм у стан глыбокага стрэсу, з якім той пачынае спраўляцца звычайна толькі ў сярэдзіне другога тыдня адпачынку, але гэта ўсяго за некалькі дзён да вяртання на радзіму. А там зноў тыдзень на акліматызацыю, які ў многіх праходзіць з рознымі, часцей прастуднымі, віруснымі захворваннямі на фоне зніжэння імунітэту. Менавіта таму адпачынак на радзіме выгадна адрозніваецца ад вандровак на далёкі поўдзень. І гэта што тычыцца здаровых людзей.

Трэба адзначыць, што нам, беларусам, пашчасціла жыць на зямлі, дзе захаваліся куткі першабытнай прыроды, некранутыя ўрбанізацыяй. Менавіта сярод такіх векавых лясоў, першародных лугоў, крыніц і рэк, якія лечаць душу і цела, калі проста знаходзішся побач, і размешчаны санаторыі ААТ "Белагразздраўніцы".

**Нервы папраўляем у "Сасновым бары", страваванне — у "Парэччы", а мужчынскае здароўе ў санаторыі "Рассвет-Любань"**

Усе санаторыі "Белагразздраўніцы" пабудаваны на крыніцах мінеральных водаў, якія, у залежнасці ад саставу, вызначылі іх медыцынскі профіль.



У **"Парэччы"** — мінеральныя воды Друскінінкайскага тыпу, уласцівасці якіх неаднаразова адзначаліся найвышэйшымі ўзнагародамі сусветных выстаў, у тым ліку залатым медалём Парыжскай выставы. Яны спрыяюць вылечванню хвароб органаў страваванне, касцёва-мышачнай сістэмы і злучальнай тканкі. Ды знаходзіцца санаторый усяго ў 17 кіламетрах ад сусветна вядомага курорта (я маю на ўвазе Друскінінкай). Так што там не толькі мінеральныя воды аднаго тыпу, але і паветра, і прырода... Толькі вось цэны на аздараўленне адрозніваюцца амаль у два разы. Так, 14 дзён адпачынку ў "Парэччы" ў стандартным аднамесным нумары абыдзецца прыкладна ў 3 190 000 — 3 400 000 руб. (невялікая разбежка па цэнах можа быць у залежнасці ад выбранага корпуса). У кошт уваходзіць 5-разовае харчаванне па ўзгодненым меню і 8-9 медыцынскіх працэдур на дзень. Для наведнікаў санаторыя працуюць "Цэнтр прыгажосці", "Цэнтр традыцыйнай кітайскай медыцыны" з высокакваліфікаванымі спецыялістамі, сучасная трэнажорная зала, водны комплекс з басейнамі для дзяцей і дарослых, ваннамі джакузі і японскай лазняй "Афура". Апошнія гады паспяхова выкарыстоўваюцца методыкі лячэння натуральнымі сокамі — сокатэрапія. А вось, напрыклад, у санаторыі "Draugyste" ў г. Друскінінкай тыя ж 14 дзён абыдуцца вам 9 200 000 (без афармлення выязных дакументаў) з 3-разовым харчаваннем па ўзгодненым меню і 4-5 працэдурамі на дзень (звесткі сайта http://www.baltia-tour.ru).

Санаторый **"Рассвет-Любань"** спецыялізуецца на захворваннях мочавыдзяляльнай сістэмы і нырак, парушэннях палавой функцыі ў мужчын, захворваннях органаў дыхання, касцёва-мышачнай сістэмы і злучальнай тканкі, абмену рэчываў, павышэнні імунітэту. У аснове санаторна-курортнага лячэння і аздараўлення ляжыць выкарыстанне натуральных прыродных фактараў: унікальнай прыроднай мінеральнай вады, аналага трускавецкай, у выглядзе ваннаў і пітва, прыроднай сапрапелевай лячэбнай гразі, Спелеакліматалякарні тыпу Салігорскай, гіруда- і апітэрапіі.

На базе санаторыя працуе Цэнтр мужчынскага здароўя, які спецыялізуецца на лячэнні эрэктыльнай дысфункцыі ў мужчын, у ім наведнікі санаторыя могуць атрымаць кансультацыі спецыялістаў з ліку прафесарска-выкладчыцкага складу Беларускай медыцынскай акадэміі.

Сумесна з кафедрай уралогіі і нефралогіі БелМАПА распрацавана і паспяхова выкарыстоўваецца праграма прафілактыкі і лячэння прыроднай мінеральнай вадой пацыентаў з рознымі захворваннямі нырак, у тым ліку пасля драблення камянёў.

Недалёка ад Мінска, у Маладзечанскім раёне, размешчаны яшчэ адзін санаторый ААТ "Белаграздраўніца" — **"Сасновы бор"**, які спецыялізуецца на лячэнні захворванняў нервовай сістэмы, органаў дыхання, стрававання, мочапалавой сістэмы і сістэмы крыватоку. Два гады запар, у 2008 і 2009-ым, санаторый прызнаваўся лепшым у рэспубліцы. Тут створаны ўнікальны для Беларусі гідрапарк з сістэмай фантанаў і каскадаў. А мінеральную ваду чартакскага тыпу са свідравіны, што знаходзіцца на тэрыторыі санаторыя, можна піць праз эксклюзіўны бювет, аналагаў якому ў нашай краіне няма.

**"Радон" — гэта ўжо брэнд**



І не проста гіпатэтычны — дыпламаваны, бо стаў у 2011 годзе бронзавым пераможцам прафесійнага рэспубліканскага конкурсу "Брэнд года".

"Радон" — адзін з буйнейшых і самых вядомых у нашай рэспубліцы санаторыяў. Ён размешчаны ў маляўнічым кутку Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці, дзе захавалася першародная прыгажосць сасновага лесу і лугоў у месцы зліцця дзвюх рэк — Моўчадзі і Паніквы.



Медыцынскі профіль санаторыя — гэта лячэнне захворванняў касцёва-мышачнай сістэмы і злучальнай тканкі, захворванняў нервовай сістэмы, хвароб жаночых і мужчынскіх палавых органаў. Ён абумоўлены ўнікальнымі для Беларусі натуральнымі радонавымі водамі, якія здабываюцца з глыбіні 300 м, і лячэбнымі сапрапелевымі гразямі возера Дзікае. У сукупнасці яны спрыяюць нармалізацыі ўсіх відаў абменаў у арганізме, аказваюць абязбольвальнае, супрацьзапаленчае і заспакаяльнае дзеянне, павышаюць імунітэт, паляпшаюць працу сэрца, нармалізуюць артэрыяльны ціск.

Санаторый пастаянна абнаўляе лячэбна-дыягнастычную базу, у работу ўкараняюцца новыя сучасныя медыцынскія тэхналогіі. Акрамя традыцыйнага санаторна-курортнага лячэння: фізіятэрапіі, вода- і гразелячэння шырока выкарыстоўваюцца новыя метады, напрыклад, спелеакліматалячэнне ў спелеакліматакапсуле, створанай з руды Салігорскага калійнага басейна — градзірні; працуюць Цэнтр мужчынскага здароўя і Цэнтр традыцыйнай кітайскай медыцыны. У санаторыі вядуць прыём 18 спецыялістаў, у тым ліку неўролаг, уролаг, гінеколаг, касметолаг і інш.

Пра "Радон" можна шмат гаварыць, але лепш яго наведаць, небеспадстаўна лічаць у "Белаграздраўніцы". Гэта доказвае той факт, што больш за 85% наведнікаў прыязджаюць сюды па лячэнне 2-6 разоў — па прычыне доўгатэрміновай рэмісіі і магчымасці адмовіцца ад дарагіх лекаў.

Агульным для ўсіх санаторыяў ААТ "Белаграздраўніца" з'яўляецца прымяненне ў лячэнні перадавых медыцынскіх методык пад кантролем і ў пастаянным супрацоўніцтве з вядучымі спецыялістамі галіны аховы здароўя, профільнымі кафедрамі медыцынскіх універсітэтаў і Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Для аказання высокакваліфікаванай кансультацыйнай дапамогі заключаны дагаворы з

вядучымі рэспубліканскімі цэнтрамі: РНПЦ Анкалогіі і медыцынскай радыялогіі, РНПЦ "Кардыялогія"; Рэспубліканскай бальніцай рэабілітацыі і бальнеалячэння, НДІ фізіялогіі НАН РБ і 4-й Мінскай гарадской клінічнай бальніцай.

Пастаяннае абнаўленне медыцынскай базы, развіццё інфраструктуры і сэрвісу патрабуюць вялізных матэрыяльных укладанняў, якія потым з лішкам акупляюцца за кошт росту папулярнасці і запатрабаванасці санаторыяў.

**Даведка**

*ААТ "Белагразраўніца" ўжо больш за 30 гадоў займаецца арганізацыяй санаторна-курортнага лячэння і аздараўлення. Штогод установы арганізацыі наведваюць каля 50 тысяч дарослых і дзяцей. У склад аб'яднання ўваходзяць санаторыі "Радон", разлічаны на 450 дарослых наведнікаў з дзіцячым аддзяленнем "Баравічок" на 170 месцаў, "Сасновы бор" — на 280, "Парэчча" — таксама на 280, "Рассвет-Любань" — 215 дарослых і 150 дзяцей у аддзяленні "Зарніца"; таксама дзіцячыя санаторыі "Случ", "Расінка", "Сонейка", "Налібоцкая пушча", разлічаныя на 1456 месцаў, што складае больш за 60% дзіцячага санаторнага фонду Беларусі. Летась усе санаторыі прайшлі атэстацыю Рэспубліканскай камісіі і пацвердзілі высокі статус санаторна-курортных арганізацый першай катэгорыі, а ААТ "Белагразраўніца" было прызнана лепшым санаторна-курортным аб'яднаннем нашай рэспублікі.*

**Інвестыцыі ў будучыя пакаленні**

Нельга абмінуць вялізную работу па планавым аздараўленні і лячэнні дзяцей, якая вядзецца дзіцячымі санаторыямі "Белагразраўніцы" — "Случ", "Сонейка", "Налібоцкая пушча", "Расінка", дзіцячымі аддзяленнямі "Баравічок" санаторыя "Радон" і "Зарніца" санаторыя "Рассвет-Любань". Усе санаторыі прымяняюць сучасныя лячэбна-дыягнастычныя методыкі, такія як спелеакліматалячэнне, электрасвятлолячэнне, лазерамагнітатэрапія і інш., пастаянна абнаўляецца клініка-дыягнастычная база. Так, на працягу 2008—2009 гадоў ва ўсіх санаторыях былі адкрыты спелеакліматалячэбніцы (аналаг падземных салявых пячор). У санаторыі "Расінка" паспяхова развіваецца новы для Беларусі медыцынскі кірунак — эндаэкалагічная медыцына, пражыванне пацыентаў арганізавана ў асобных экалагічных драўляных катэджах з усімі выгодамі. Уся мэбля толькі з натуральных матэрыялаў, ніякай сінтэтыкі і пластыка, нават сцежкі з дрэва. Крок з парога — і тваім здароўем займаюцца не лекары, а сама прырода. Гэтая методыка распрацавана расійскім прафесарам Левіным і прапануецца перш за ўсё тым, хто пацярпеў ад бурнага гарадскога жыцця, забруджанага паветра, шуму мегаполіса і душнага офіса. Натуральнае лячэбнае харчаванне, уласная мінеральная вада, здабытая з глыбіні 350 метраў, лячэбныя гразі проста твораць цуды з пацыентамі.



Акрамя лячэння і адпачынку, ва ўсіх дзіцячых санаторыях наладжана круглагадзічнае навучанне па школьнай праграме. Для гэтага створаны і абсталяваны сучасныя класы, працуюць высокакваліфікаваныя педагагічныя калектывы.

Гэты кірунак дзейнасці ААТ"Белагразраўніца" ідзе ў цеснай звязцы з дзяржаўнымі праграмамі па ўмацаванні здароўя дзяцей. Таму большая частка пуцёвак выкупляецца дзяржавай. Гэта немалыя грошы, але яны не патрачаны ўпустую, а інвеставаныя ў будучыя пакаленні беларусаў.

Таццяна Салаўёва. Гаючая сіла беларускай прыроды ў руках руплівых гаспадароў

**Матэрыялы падрыхтавала Таццяна Салаўёва.**